*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР

1989

18

МАЯ

№ 17(1610)

## СПЯШАЙЦЕСЯ УБАЧЫЦЬ!

Толькі тры дні — сёння, заўтра і паслязаўтра, працягнецца фестываль пантамімы і клаунады «Блазан-89». Вас чакаюць сустрэчы з лепшымі тэатрамі-студыямі рэспублікі і краіны. У фестывалі прымуць удзел: «Праметэй», «Жэст», «Аблічча», «Тунель» (Мінск), «Блікі» (Наваполацк), «Дзеці капітана Гранта» (Магілёў), «Сёй-той» (Свярдлоўск), група І. Плехава (Томск).

Прадстаўленні пройдуць у Палацы культуры прафсаюзаў.

Т. ДОЎНАР.

## ЯК СПРАВЫ, ПРАЦОЎНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА?

— спытаеце вы.

— Нармальна,— пачуеце ў адказ.

Але не суцяшайце сябе думкай, маўляў, якія мы дысцыплінаваныя, бо розных парушэнняў у нас яшчэ хапае. Хоць часам і не звяртаем на іх увагі: прывыклі ўжо, што на работу не спяшаемся, а прыйшоўшы, займаемся ўласнымі справамі.

На апошнім пасяджэнні рэктарата прарэктар па вучэбнай рабоце, прафесар В. Г. Ціхіня праінфармаваў прысутных аб стане працоўнай дысцыпліны ва універсітэце і абнародаваў меры па яе ўзмацненню.

З. МІХНЕВІЧ.

## ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ КАМУНІСТАЎ

і паляпшэнне ідэалагічнай, палітыка-выхаваўчай работы ў калектыве універсітэта — вось тэма размовы, якая вялася на апошнім пасяджэнні партыйнага камітэта БДУ.

З. ВАЛНІСТЫ.

## НАВЕДАЙЦЕ ГІСТАРЫЧНЫЯ СЕРАДЫ!

—заклікае аб'ява ў галоўным корпусе. Тыя, хто пабываў на першай сустрэчы, дзе ішла размова аб утварэнні СССР, не пашкадавалі і завіталі на другую — яна адбылася 19 красавіка, і трэцюю — 10 мая. Дарэчы, тэма апошняй, упэўнена, не пакінула абыякавым нікога. Гутарку аб старым Мінску вёў кандыдат гістарычных навук З. В. Шыбека. А ў перапынку прысутныя мелі магчымасць атрымаць задавальненне ад прагляду калекцыі дарэвалюцыйных паштовак, якую сабраў і выставіў доктар філалагічных навук А. І. Мальдзіс.

Пасяджэнні праводзяцца ў форме «круглых сталоў», прэс-канферэнцый, навуковых дакладаў і паведамленняў з абмеркаваннем, а таксама дыялогаў і дыскусій.

Калі вы яшчэ не змаглі трапіць на гістарычныя серады, вас чакаюць у бібліятэцы імя Я. Купалы (вул. В. Харужай, 16) 24 мая (нагадаем, што пасяджэнні праводзяцца два разы ў месяц — праз сераду).

З. АЛЯКСАНДРАВА.

## А Ў ВАС? А Ў НАС!

# Вось ён — сюжэт!

Дэбора Ан Марціна Амір, студэнтка трэцяга курса факультэта журналістыкі, прыехала вучыцца ў Мінск з Паўднёвай Амерыкі, з Гаяны. Нядаўна разам са сваёй групай Дэбора пабывала на экскурсіі ў майстэрні вядомага беларускага скульптара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР Івана Якімавіча Міско. Якраз тады дзяўчына была заклапочана пошукамі сюжэту для відэастужкі, якую ёй патрэбна было прадставіць у якасці вучэбнай перадачы. Калі Дэбора разам з усімі слухала расказ пра работу над скульптурнымі партрэтамі касманаўтаў, удзельнікаў міжнародных экспедыцый па праграме «Інтэркосмас», зразумела: вось ён — сюжэт. Скульптар ахвотна згадзіўся спецыяльна для студэнткі яшчэ раз падрабязна расказаць пра сваю работу. Неўзабаве Дэбора прыйшла ў майстэрню з тэхнікам факультэта журналістыкі Міхаілам Вацлававічам Лазарчыкам.

Па напісанаму ёю сцэнарыю была зроблена перадача, студэнтка атрымала станоўчую адзнаку. А ў якасці падарунка павязе ў далёкую Гаяну здымак, на якім Дэбора Ан Марціна Амір бярэ інтэрв'ю ў беларускага скульптара І. Я. Міско.

М. КЕНЬКА,
член грамадскай рэдакцыі.
Фота АЎТАРА.

## ПІНГ-ПОНГ

# Ільготная адукацыя?

*У адным з нядаўніх нумароў «Комсомольской правды» паведамлялася, што ў Белдзяржуніверсітэце імя У. І. Леніна, як і ў шэрагу іншых ВНУ краіны, ужо больш года існуе даволі зручная форма навучання — экстэрнат. Многіх студэнтаў, і яшчэ больш «нестудэнтаў», заінтрыгавала такое новаўвядзенне, аднак скупыя звесткі «Комсомолки», відаць, не задаволілі іх цікавасць. Таму да нас, у рэдакцыю «Беларускага універсітэта», звярнуліся з просьбай больш падрабязна растлумачыць сістэму экстэрнату.*

На пытанні чытачоў адказвае загадчык вучэбнага аддзела універсітэта Вадзім Мікалаевіч ЦЯСЛЕНКА.

Сапраўды, пасля дваццаціасьмігадовага перарыву, у мінулым годзе ва універсітэце быў адноўлены экстэрнат. Згодна з Палажэннем і да Загаду Старшыні Дзяржкамітэта па народнай адукацыі ў экстэрнат прымаюцца асобы з сярэдняй адукацыяй, якія не маюць магчымасці вучыцца на дзённых аддзяленнях без адрыву ад вытворчасці. Жадаючых такім чынам атрымаць адукацыю было вельмі многа. Прычым, звярталіся да нас нават кандыдаты навук. Аднак хутка з'явілася яшчэ адно удакладненне: экстэрнат створаны з мэтай даць магчымасць набыць вышэйшую адукацыю людзям, якія пазбаўлены апорнарухальнага апарату, не могуць прыходзіць на залікі і экзамены. Пакуль што такіх навучэнцаў у нас ва універсітэце няма, таму экстэрнат фактычна не існуе.

# ЗА СЛАВАЛЮБСТВАМ АБО... ГРАШЫМА?

Напэўна, большасць з нас узрадаваліся, адчуўшы, што ў грамадстве на афіцыйным узроўні атрымала прызнанне важкасць матэрыяльнага стымулу для любой справы, і вучобы таксама.

Кожны студэнт, праседжваючы за падручнікамі ночы напярэдадні экзамену або пазбаўляючы сябе паездкі дадому з-за нежадання прапусціць чарговы семінар, марыць аб добрых адзнаках у залікоўцы не толькі для таго, каб задаволіць сваё самалюбства і забяспечыць сабе больш шырокі выбар пры размеркаванні на апошнім курсе. Усім патрэбна стыпендыя. Тым больш, калі яе памеры набліжаюцца да сумы месячнай зарплаты сярэдняга спецыяліста.

Існуе пэўны арэол вакол тых нашых калег-студэнтаў, якія атрымліваюць імянныя стыпендыі. Але няхай не ўздыхаюць сённяшнія і заўтрашнія першакурснікі. Дакладней, тыя з іх, хто атрымаў у час першай сесіі толькі выдатныя адзнакі і збіраецца паўтараць гэты подзвіг кожныя паўгода вучобы ва універсітэце, а яшчэ заўсёды быць прасякнутым грамадскімі справамі свайго факультэта і самаддана займацца навуковай работай. Ведайце — вашы старанні будуць узнагароджаны і матэрыяльна.

Акрамя агульнавядомай Ленінскай стыпендыі (130 рублёў), Міністэрства народнай адукацыі БССР выдзяляе грошы універсітэту для ўзнагароджання лепшых студэнтаў іншымі імяннымі стыпендыямі. На розных факультэтах ім даюць розныя імёны— выдатных людзей з далёкай і нядаўняй гісторыі. Ёсць у нашым універсітэце стыпендыі імя К. Маркса, Калініна, Шверніка і іншыя.

На філалагічным факультэце, напрыклад, лепшыя студэнты атрымліваюць аднолькавую суму —110 рублёў (акрамя Ленінскай стыпендыі) у месяц, але назва ў кожнай з іх асабістая: імя Я. Купалы, Я. Коласа, П. Броўкі, нядаўна з'явілася яшчэ адна — імя Ф. Скарыны.

Якая дзіўная мэта — наблізіць сваё імя да каго-небудзь з вялікіх. Вы толькі ўявіце сабе: ваша прозвішча запісана ў адным радку і вымаўляецца побач з... Справа за вамі!

Падрыхтаваць гэты матэрыял нам дапамаглі: старшы бухгалтар аддзела стыпендый Т. У. Каўшэвіч і студэнт 4-га курса філфака У. Рагойша.

*Здаецца, нас павінен яднаць агульны студэнцкі гарадок, дзе вучыцца пераважная колькасць студэнтаў. І большасць інтэрнатаў размешчана побач з той жа мэтай. Але мы добра адчулі, што вучымся разам — матэматыкі, географы, фізікі... і ўсе астатнія, — калі пакінулі не толькі аўдыторыі і інтэрнацкія блокі, але і сам горад.*

*Калі прыехалі ў Вязынку, каб быць разам!*

*Каб адсвяткаваць універсітэцкі «Фестываль-89»!*

Гістарычны дзень трынаццатага мая абяцаў быць няўдачлівым. Марасіў дождж. «Самым змрочным на гэтым фестывалі быў мой настрой» — адразу ўявіў я газетны рублены загаловак будучага рэпартажу. Але я глыбока памыляўся.

Непадалёку ад станцыі Вязынка ў гэты час моклі пад дажджом салдацкія палаткі, а ў іх з чырвонымі ад бяссонніцы вачыма сядзелі безжурботныя студэнты, якія прыехалі сюды яшчэ ў пятніцу, дванаццатага

(Працяг на 2-й стар.).



# У ДУБРАВЫ ЯШЧЭ АДЗІН ГАСПАДАР

**Спачатку гэта была сустрэча двух працiўнікаў. Але яны ператварылі яе ў дзелавую размову і здолелі нарэшце прыняць рашэнне, якое можна назваць гістарычным. Тыя, каго хвалюе лёс дубравы каля вёскі Шчамысліца, напэўна, пагадзяцца з гэтым.**

**На біялагічным факультэце сустракаліся яго выкладчыкі, студэнты і прадстаўнікі НДІ прыкладных фізічных праблем і канструктарскага бюро, якія маюць патрэбу ў будынку побач з дубравай. Прыйшлі сюды таксама прарэктары універсітэта, работнікі вучэбна-вопытнай гаспадаркі «Шчамысліца» і, зразумела, грамадскасць.**

**Цяжка было размаўляць — процілеглыя інтарэсы сутыкнуліся, але знайшлі канчатковы варыянт. Будынак СКБ будзе ўзводзіцца побач з будынкам НДІ ПФП.** Прадстаўнікі бюро паабяцалі спачатку зрабіць агароджу вакол дубравы, правесці ў Шчамысліцу дарогу ад апошняга прыпынку 47-га аўтобуса і каналізацыю, а таксама добраўпарадкаваць стадыён: пабудаваць трыбуны, раздзявальні з душавымі, а потым і басейн для студэнтаў БДУ і супрацоўнікаў НДІ ПФП. Грамадскі кантроль за ажыццяўленнем гэтых абяцанняў даручана ўзначаліць Леаніду Максімавічу Лук'яновічу, дэкану спецфакультэта «Экалогія і павышэнне эфектыўнасці выкарыстання прыродных рэсурсаў».

Даволі мірны фінал. Але пачыналася ўсё інакш.

Сустрэліся на месцы, за якое прыйшлі змагацца — паміж стадыёнам і будынкам НДІ ПФП. Пакуль бераглі сілы для будучых «баёў»: размаўлялі ціха, катэгарычна не выказваліся. А потым расселіся ў аўдыторыі і пачалі!..

Вядучым абралі Л. М. Лук'яновіча. Ён расказаў, як многа будоўляў планавалася нядаўна каля дубравы, назваў тыя з іх, якія ўжо зацверджаны: новы корпус біялагічнага факультэта, вучэбны корпус і інтэрнат для замежных студэнтаў, а таксама сталовая. Што ж будзе, калі да ўсяго гэтага далучыць яшчэ і будоўлю СКБ на 350 чалавек? «Сёння нам трэба вырашыць гэту праблему», — закончыў Леанід Максімавіч.

Але ж прадстаўнікі будучага канструктарскага бюро прыйшлі на размову з ужо зацверджаным праектам будынка, які абышоўся ў 200 тысяч рублёў.

Д. І. САГАЙДАК, загадчык лабараторыяй фізікі і хіміі арганічных злучэнняў НДІ ПФП:

— Дубрава — у паміраючым стане, проста лозунгамі яе не зберагчы. Ніякіх рашучых мер па яе ахове пакуль не было. Сапраўдным гаспадаром гэтага помніка прыроды стане той, хто будзе несці за яго адміністратыўную і, магчыма, нават крымінальную адказнасць, той, у каго будуць фінансы. Мы бярэмся стаць такімі гаспадарамі! Супрацоўнікі СКБ правялі ўжо два нядзельнікі па ўборцы дубравы. А пакуль узводзіць тут новы будынак, мы абяцаем зрабіць агароджу дубравы і добраўпарадкаваць стадыён, нават басейн пабудаваць.

Ці будзе новая будоўля каля дубравы памылкай? Не! Спецыялісты падцвердзілі, што наш будынак не акажа дрэннага ўплыву на глебу, ён будзе ўзводзіцца на апорах, якія вібраізалююць яго ад зямлі. Зразумейце — гэта КБ вылічальнай тэхнікі, і пагоршыць экалагічны стан яно не можа.

На Захадзе падлічана, што па-сапраўднаму дзелавыя, эфектыўныя адносіны паміж начальнікам і падначаленым могуць існаваць толькі тады, калі іх раздзяляе не больш, чым 5 хвілін пехатой. КБ трэба будаваць тут!

І. А. САКАЛОВА, дырэктар Батанічнага сада БДУ, перш за ўсё не пагадзілася з тым, што дубрава знаходзіцца ў паміраючым стане:

— У будучым дубрава можа стаць дэндрапаркам вучэбнага значэння, не гаворачы ўжо пра яе вялікую ролю фільтра для некалькіх раёнаў горада. Ні аб якой будоўлі не можа быць і размовы!

І. К. ЛАПАЦІН, загадчык кафедры заалогіі, прафесар:

— Мне зразумела ўпэўненасць прадстаўнікоў СКБ: мець тут свой будынак ім сапраўды зручна. Але можа ёсць магчымасць знайсці кампраміснае рашэнне?

Безумоўна, ёсць людзі, якіх не задаволіць любое рашэнне, узнімецца грамадскасць, як гэта часта здараецца. Трэба, каб увесь універсітэт, а не адзін біяфак «галадранец», узняўся на абарону дубравы і заявіў: «Мы — гаспадары!»

С. В. МАКАРЭВІЧ, загадчык кафедры фізкультуры і спорту:

— Як спецыяліст, лічу, што стадыёну месца хопіць побач з будынкам СКБ. І зразумела, якой карыснай будзе для нас фінансавая дапамога.

А. Ф. ЧАРНЯЎСКІ, дырэктар НДІ ПФП:

— Мы хутка адчуем цяжкія вынікі справакаванага пераходу навукі ў ВНУ на гасразлік. Таму размову, магчыма, давядзецца весці нават пра выжыванне гэтай навукі. Чаму ж не выкарыстаць універсітэту нашу дапамогу?

Дубраве ўжо нанесена шмат шкоды, і гэты працэс працягваецца: недалёка працуе ТЭЦ-4, побач — кальцавая аўтадарога, «Інтэграл». Навошта падлічваць, колькі чалавечых ног будуць таптаць гэту глебу ў хуткім будучым, калі ўжо сёння ў дубраве пасуцца «буронкі» вясковых жыхароў?

С. РУБАХІН, студэнт 4-га курса біяфака:

— Асабіста я адчуваю боязь, што нас зноў падмануць. Так, гэта вялікая сума, што выдзелена на будоўлю, — 18 мільёнаў. Але дзе гарантыі, што дастатковая частка гэтых грошай пойдзе на карысць дубраве? Пачнуцца недаробкі, «дзіркі» у будаўніцтве... Спачатку — хай займуцца дубравай, а потым ужо пачынаюць будаўніцтва. З нашага дазволу, зразумела.

У. І. ТАРАСЕВІЧ, прарэктар універсітэта па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце:

— Ужо 10 год вядзецца размова пра будаўніцтва новых карпусоў універсітэта. Нарэшце з'явілася магчымасць здзейсніць яго. І нельга такую магчымасць згубіць. Давайце будзем гаспадарамі! І не будзем забываць, што пакуль дубрава знаходзіцца на балансе універсітэта.

**Вельмі эмацыянальная атрымалася размова. Наўрад ці канчаткова заспакоіць яна тых, у каго «баліць душа» за дубраву: толькі агароджай помнік прыроды не захаваць ад злых рук і шматлікіх ног. А тым больш, як дакладна засведчыў адзін з удзельнікаў сустрэчы,— лозунгамі і размовамі.**

**В. БЯГУН.**

ДЗЕЛІМСЯ ВОПЫТАМ

# Карысная ініцыятыва

## АБ ТЫМ, ЯК НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЖУРНАЛІСТЫКІ ПРАВОДЗЯЦЦА ДНІ ГРАМАДЗЯНСКАЙ АБАРОНЫ

Ад чыста абарончых мерапрыемстваў жыццё павярнула сістэму грамадзянскай абароны тварам да новых праблем — сацыяльнай бяспекі насельніцтва.

Аналіз падзей на Чарнобыльскай АЭС, у Арзамасе, Літве, Арменіі, іншых незвычайных здарэнняў прымусіў нас іначай паглядзець на праблему бяспекі ў мірны час. Праведзеныя заняткі дазволілі выкладчыкам і супрацоўнікам факультэта пераканацца, што сёння людзі павінны ўмець на практыцы абараніць не толькі сябе, але і іншых ад стыхіі, катастроф і аварый.

Дзякуючы гэтаму змяніліся адносіны выкладчыкаў і супрацоўнікаў да арганізацыі грамадзянскай абароны. І калі раней яны часта пакідалі без увагі гэтыя заняткі, то зараз праяўляюць да іх цікавасць — стараюцца выпрацаваць пад кіраўніцтвам вопытных спецыялістаў якасці, неабходныя для таго, каб у экстрэмальных умовах быць гатовымі паказаць стойкасць, здольнасць супрацьстаяць боязі і паніцы, абараніць сябе і іншых ад вынікаў незвычайнага здарэння.

У той дзень адбыліся заняткі па наступных тэмах вучэбнага плана: апавяшчэнне і інфармацыя насельніцтва аб экстрэмальных сітуацыях, парадак дзеянняў па параджальнаму сігналу «Увага ўсім!»; парадак атрымання, падрыхтоўкі і выкарыстання сродкаў індывідуальнай абароны; эвакуацыя з раёнаў стыхійных бедстваў, аварый, зон заражэння і катастрафічнага затаплення; медыцынскія сродкі абароны; моцнадзейныя ядавітыя рэчывы і абарона ад іх. Закончыўся дзень грамадзянскай абароны праглядам і абмеркаваннем спецыяльных кінастужак па тэматыцы вучэбнага плана.

Звычайна такія дні грамадзянскай абароны праводзяцца на факультэце два разы на працягу вучэбнага года. Яны, на наш погляд, заслугоўваюць адабрэння. У чым жа перавага такой арганізацыі заняткаў? Перш за ўсё ў тым, што ў іх правядзенні ўдзельнічаюць вопытныя спецыялісты — начальнік штаба ГА Л. М. Мельнікаў, загадчык кафедры грамадзянскай абароны Л. А. Фралоў, выкладчыкі гэтай кафедры, супрацоўнікі хімічнага факультэта. Яны валодаюць глыбокімі ведамі і трывалымі практычнымі навыкамі і, натуральна, праводзяць заняткі цікава.

Нам жа гэтыя веды патрэбны не толькі ў экстрэмальных сітуацыях, але і ў паўсядзённым жыцці, асабліва калі ўзнікае неабходнасць своечасова аказаць першую даўрачэбную дапамогу. Здарыўся сардэчны прыступ на вуліцы, у транспарце, узнікла неабходнасць спынення крыві ў пацярпеўшага, спатрэбілася тэрміновая дапамога атручанаму газам — ці кожны з нас зможа нешта зрабіць? Выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта журналістыкі, напэўна. Яны атрымалі веды на занятках у сістэме грамадзянскай абароны. Зразумела, такіх ведаў не змаглі б даць кіраўнікі вучэбных груп з ліку выкладчыкаў факультэта. Гэта пад сілу толькі высокакваліфікаваным спецыялістам.

Безумоўна, было б няправільным абмяжоўвацца правядзеннем дзён грамадзянскай абароны, таму што яны дазваляюць толькі атрымаць неабходныя тэарэтычныя веды і першапачатковыя навыкі практычных дзеянняў. А затым выкладчыкі і супрацоўнікі ўдасканальваюць іх непасрэдна на занятках у групах.

Акрамя практычнай адпрацоўкі адпаведных нарматываў, у групах арганізуецца абмеркаванне спецыяльных тэлеперадач па грамадзянскай абароне, вучэбных і мастацкіх фільмаў, практыкуюцца сустрэчы з удзельнікамі ліквідацыі вынікаў незвычайных сітуацый, аварый і г. д. Гэта дадатковыя мерапрыемствы, не прадугледжаныя планам. Яны значна паглыбляюць нашы пазнанні. На занятках у групах часта таксама абмяркоўваюцца рэфераты, з якімі выступаюць выкладчыкі і супрацоўнікі. Тэмы іх самыя розныя, напрыклад, аб небяспецы для нашага горада аб'ектаў, якія выкарыстоўваюць або вырабляюць ядавітыя рэчывы.

Сталі папулярнымі на факультэце дні грамадзянскай абароны. І наведванне заняткаў дастаткова высокае, пропускаў без уважлівых прычын амаль не бывае. Гэтаму ў многім садзейнічае тое, што ў выкладчыкаў і супрацоўнікаў факультэта журналістыкі выпрацаваліся адказныя адносіны да сістэмы грамадзянскай абароны. Пытанні гэтыя абмяркоўваюцца на партыйных сходах, на пасяджэннях савета факультэта і кафедраў. Засталіся ў мінулым абыякавыя адносіны да сістэмы грамадзянскай абароны.

**Б. ІЛЬІН.**

ШТО НОВАГА?

# Прапаведнік на... дыскатэцы

***Адбылася сустрэча заходнегерманскіх студэнтаў тэалагічнага факультэта Універсітэта з выкладчыкамі і студэнтамі БДУ імя У. І. Леніна. Яна праходзіла ў Доме дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі.***

***У дыскусіі таксама прынялі ўдзел намеснік упаўнаважанага па справах рэлігій пры Савеце Міністраў БССР Т. Р. Купчэня, свяшчэннік мінскага Кафедральнага сабора Я. В. Грушчэўскі, старшы прасвітэр евангельскіх хрысціян-баптыстаў І. В. Букаты.***

***Пасля таго, як было прачытана некалькі рэфератаў па пытаннях рэлігій ў Заходняй Германіі і дзейнасці Рускай праваслаўнай царквы на сучасным этапе, госці адказвалі на самыя розныя пытанні.***

— Колькі гадоў працягваецца вучоба ва Універсітэце і якую спецыяльнасць атрымліваюць выпускнікі?

— Тэрмін навучання ў нас, як і ва ўсіх універсітэтах ФРГ,— 6 гадоў. Усе мы ў асноўным будзем працаваць пастарамі.

— А дзяўчаты?

— Няма розніцы,— расказвае Сабіна Керскен.— Пасля заканчэння дзяўчаты будуць працаваць прапаведнікамі ў нашых цэрквах. Як вядома, жанчыны намнога больш сардэчныя і пяшчотныя, чым мужчыны, таму ім лепш падыходзіць роля суцяшальнікаў. Вера не забараняе нам апранацца ў сучаснае моднае адзенне. Ці атрымаецца ў вас уявіць мяне ў чорнай расе за кафедрай?

Мы будзем працаваць усяго адзін дзень у тыдзень. У вольны час можна схадзіць у рэстаран, тэатр ці на дыскатэку і іншыя забаўляльныя мерапрыемствы. Атрымліваем ад 500 да 1000 нямецкіх марак.

— Якія дысцыпліны вы вывучаеце на факультэце?

— У асноўным гэта спецыяльныя прадметы, звязаныя з багаслоўем, і мовы: англійскую, грэчаскую, яўрэйскую. Да спецпрадметаў адносяцца: гісторыя царквы, царкоўная псіхалогія, дагматыка і іншыя.

— У чым асаблівасць вашага веравучэння?

— Важная роля ў нашым

вучэнні належыць дагмату грэхападзення чалавека і вучэнню аб апраўданні. Згодна з нашым вучэннем, першародны грэх не толькі нашкодзіў прыродзе чалавека, але і цалкам сказіў яе. Выратаванне можа прыйсці толькі як вынік боскага ўмяшання, «дарам данай раскошы». Асноўным з'яўляецца дагмат аб выратаванні адной верай у збавіцельную ахвяру Хрыста. Іншыя спосабы дасягнуць выратавання (таінства, добрыя справы) лічацца неістотнымі.

— На заканчэнне хочацца спытаць, якія ў вас уражанні аб нашай краіне?

— Здаецца, што мы нікуды не выязджалі. Розніца толькі ў мове, якую мы чуем усюды, і якую, дарэчы, вельмі дрэнна ведаем.

**А. ГУСАК,**
**студэнт гістарычнага факультэта.**
**Фота АЎТАРА.**

НЯМА ПРАБЛЕМ?

# ТАК І МАЕМСЯ

Дзверы блока мне адчыніў замежнік. Праходжу ў душнае памяшканне. У госці да студэнцкай сям'і (пакой «А»): Тані, Дзімы і іхняга Лёшкі.

Звычайная казённая мэбля. Узяты напракат тэлевізар. Тут жа, на стале: кнігі, посуд, ежа. Усё, што ўмясцілася ў «іх» двухмесны пакой.

Я прыгадваю падобнае становішча яшчэ адной студэнцкай сям'і.

Галю і Ігара ў інтэрнат засялілі, але яе — у жаночы блок, яго — у мужчынскі. Аднаго пакоя не знайшлося.

— Вось так мы і маемся,— гучаць прывітальныя словы Дзімы.— Гэта памяшканне — інвентарнае. Наш пакой заняў замежны студэнт. Таму я ўнёс свае рэчы сюды. Зразумела, нелегальна. Пакуль малому няма аднаго года, нас ніхто не мае права выселіць. Што будзе потым — не ведаю.

У кожным інтэрнаце ёсць падсобныя памяшканні, якія год ад году пустуюць. Гэта тыя ж бытоўкі, інвентарныя пакоі, пакоі адпачынку. Усё часцей чуюцца галасы аб іх непатрэбнасці. Хаця, прабачце, што б тады ўначы, калі ніхто не бачыць, штурмавалі ўзбуджаныя мужы-студэнты? Часам, здараецца, некаму пашанцуе, а астатнія стаяць у чарзе на атрыманне жылля ў інтэрнаце. Зараз яна налічвае сорак шэсць студэнцкіх сям'яў.

Сямейнымі лічацца інтэрнаты № 3 і № 4. На пражыванне ў першым студэнты згаджаюцца, хоць і не наездзішся ў горад кожны дзень, калі вучышся на фізфаку ці ФПМ. Што казаць пра дабрабыт тых, каго пасялілі ў юрфакаўскім інтэрнаце, дзе на ўвесь паверх толькі адна душавая і дзве прыбіральні? А калі ў сям'і немаўлятка, якога рэкамендуюць купаць амаль штодня?

Гэта пра ўмовы жылля. А як «расцягваць» грошы? Дзве стыпендыі — 100—110 рублёў, ды трыццаць рублёў прафкомаўскай дапамогі гады ў рады. Вось і ўвесь бюджэт.

Маім новым знаёмым у гэтым месяцы трэба трыццаць дзён есці, купіць туфлі Тані, ложачак, распашонкі, паўзункі і ў дадатак цацкі для Лёшы, куртку Дзіму... Карацей, хопіць толькі на жыццё і на Лёшку. Нават пры адчувальным укладзе бацькоўскіх грошай.

— Прыйдзецца нам, Танюшка, пачакаць,— заканчвае Дзіма нескладаныя падлікі.

Месяц? Два? Хіба гэта назавеш жыццём з прыбыткам?

— А ты спрабаваў...

Так, ён наведваў не адзін аддзел кадраў. Не аднаго прадпрыемства. Так, ён не па чужых расказах зведаў простую ісціну: пры пераходзе на гасразлік прадпрыемствам проста немэтазгодна браць студэнта на часовую работу.

Цяжка ўладкавацца. А калі атрымаецца, дык вучыцца нялёгка: сям'я, работа. Што тут казаць пра кіно, тэатры: Таня — на заняткі, Дзіма — з Лёшкам, Дзіма ў бібліятэку — Таня за хатнія справы.

Добра, што ёсць магчымасць, калі трохі падрасце, уладкаваць Лёшку ў дзіцячы сад. Прафком універсітэта звычайна звяртаецца ў райвыканком па месцу жыхарства студэнцкай сям'і, там амаль ніколі не адмаўляюць.

— А яшчэ, дзе б знайсці стаўку педыятра для студэнцкай паліклінікі? — распытвае ў мяне Таня.— Дзецям нельга без медыцынскага кантролю, а спецыялістаў няма. Магчымасць адпачыць і падлячыцца летам ва універсітэцкім прафілакторыі — гэта, зразумела, не выйсце.

Ці можна лічыць студэнцкую сям'ю паўнацэннай?

Я сяджу ва ўтульным кабінеце і слухаю свайго субяседніка:

— Мне здаецца, што не трэба наогул ствараць сем'і такім маладым. Галоўнае спачатку падрыхтаваць глебу для «будаўніцтва». Калі ёсць у цябе работа, гэта значыць трывалая матэрыяльная база, ёсць тая ж кватэра — вось тады і жаніся!

Зразумела, чытач мае права запытаць: дык такое ж было і з нашымі бацькамі, навошта рабіць з гэтага праблему?

Але навошта мы робім самі сабе штучныя бар'еры? Каб потым праз іх праходзіць і ганарыцца дасягнутым, хаця ўвогуле стаім на месцы?

Каго вінаваціць у тым, што не кожная студэнцкая сям'я можа наняць пакой, абзавесціся сваёй мэбляй, стварыць — самае галоўнае — аптымальныя ўмовы для выхавання сына ці дачкі? У нейкай ступені можна пакрыўдзіцца на прафком, на камітэт камсамола, на сваіх бацькоў...

Але, мне здаецца, мы таксама вінаватыя. Хто выбірае студсаветы, «самакіруючых» камендантаў? Хто дазваляе «дзядзьку з вуліцы» вырашаць свае лёсы? Мы нічога не можам самі. Усяго баімся, за ўсё дрыжым.

Пытаю прозвішча ў Дзімы:

— Толькі я прашу: не пішыце яго ў газеце, бо непрыемнасцей будзе шмат...

Я выконваю просьбу і мяняю нават імёны.

Ён — сем'янін. Калі скажа штосьці адкрыта, іх выставяць з пакою, які яны займаюць незаконна. Выставяць за «АДКРЫТА». Вы разумееце, якія гэта словы? Мы атрымалі права голасу, але паранейшаму баімся што-небудзь сказаць.

**А. ГАЎРЫЛЬЧЫК,**
**студэнтка факультэта журналістыкі.**
**Фота С. ГРЫЦА.**

# Вогненебяспечна!

**Кожнаму чалавеку ў яго паўсядзённым жыцці даводзіцца карыстацца паліўнымі сродкамі і газам. Але людзі часам забываюцца аб небяспецы, якую хаваюць у сабе гэтыя рэчывы.**

...Гэта здарылася 19 красавіка, вечарам, у Мінску на вуліцы Чыгуначнай, д. 130, кв. 15. Гаспадар кватэры В. М. Кузняцоў, рыхтуючыся да паездкі на дачу, заправіў прапанам пяцілітровы балон і пакінуў яго ў калідоры сваёй кватэры.

Сям'я Кузняцовых глядзела тэлевізар, калі пачуўся хлапок у калідоры. Вячаслаў Мікалаевіч выйшаў высветліць прычыну і ўбачыў, што з балона з шыпеннем вырываецца струмень газу. Кінуўся на кухню, каб выключыць газавую калонку, і не паспеў.

Грымнуў выбух, і ўся кватэра апынулася ў полымі. Адзенне жыхароў таксама. Жонка Кузняцова з двумя дзецьмі выбегла на балкон. Пятнаццацігадоваму Валодзю ўдалося перабрацца ў акно сумежнай кватэры, шасцігадовую Наташу злавілі ў разгорнутую коўдру жыхары дома.

Муж і жонка Кузняцовы цяпер знаходзяцца ў апёкавым цэнтры ў цяжкім стане. Дзеці атрымалі да дзесяці працэнтаў апёкаў скуры.

Ад выбуховай хвалі дэфармавалася міжкватэрная перагародка, у іншых кватэрах пад'езда пазрываліся дзверы, пашкодзіліся вокны.

Цяжка гаварыць аб такіх здарэннях. На жаль, яны адбываюцца, і каб больш нікому не давялося перажыць трагедыю, патрэбна строга прытрымлівацца правілаў карыстання газавымі прыборамі.

**В. ХАЛЯЎКІН,**
**інжынер групы дзяржпажнаддзору СВПЧ-13.**

# ВАС ВІТАЕ ФЕСТЫВАЛЬ!

(*Працяг. Пачатак на 1-й стар.*).

мая. Толькі нямногія адважыліся легчы спаць, астатнія ж, турысты-кансерватары, па традыцыі ўсю ноч правялі ля вогнішчаў, у чаканні яшчэ адной такой ночы, з удзячнасцю і захапленнем сустракалі новы дзень.

...На пероне стаяў вясёлы гоман. Група піянераў з рукзакамі мучыла маленькага сабачку. Людзей студэнцкай знешнасці на пероне мы так і не сустрэлі, таму сябра, што прыехаў разам са мной, сказаў: «Мы спазніліся роўна на суткі, але страцілі не так ужо і многа».

Палянка за домам-музеем была ўсеяна драўлянымі лаўкамі. На іх сядзелі слухачы.

(*Заканчэнне на 4-й стар.*).

ПАТРАБУЕ ЎКАРАНЕННЯ

# «ЖЫВАЯ» ВАДА

***Захварэла зямля. Страшэнны спусташальны мор, выкліканы людской безгаспадарчасцю і нядбайнасцю, адымаў з яе грудзей апошнія жыватворныя сокі. Выратаваць маці-карміцельку мог толькі цуд, але людзі-немаўляты даўно ўжо перасталі верыць ва ўсё, што не ўкладвалася ў рамкі іх стэрэатыпнага розуму. І ўсё ж, як у добрай чароўнай казцы, знайшоўся ў рэшце рэшт чалавек, які не страціў веру ў цудадзейную сілу. Чалавек шукаў жывую ваду. І... знайшоў.***

Дзесяць гадоў назад загадчык кафедры фізічнай геаграфіі СССР БДУ імя У. І. Леніна доктар геолага-мінералагічных навук Леанід Аляксандравіч Дземідовіч зрабіў адкрыццё. Як і ўсё геніяльнае, яно было вельмі простым. Леанід Аляксандравіч прапанаваў выкарыстаць высокамінералізаваную ваду, залежы якой у Беларусі амаль невычарпальныя — 45,5 млрд. тон, для павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур.

Інстытуту глебазнаўства прапанова вучонага здалася абсурднай. Яе адхілілі. Праўда, не адразу, а праз тры гады пасля падачы Л. А. Дземідовічам усіх неабходных вынікаў даследаванняў. Зрэшты, шматлікая доследная дакументацыя не цікавіла вучоных мужоў інстытута, бо дагэтуль высокамінералізаваная вада прымянялася ў сусветнай практыцы пераважна за мяжой і выключна для здабычы з яе ёду, брому і літыю. Ідэю Л. А. Дземідовіча нават не палічылі патрэбным навукова абвергнуць. Леаніда Аляксандравіча напачатку такі недружалюбны прыём, вядома, засмуціў. Хіба дзеля сваёй карысці стараўся, начамі праседжваў над вынікамі доследаў, спрабуючы разгадаць таямніцу загадкавай вады? Аднак, паразважаўшы, вырашыў: абурацца — апошняя справа і пакуль што марная, патрэбна даказаць на практыцы эксперыментальным шляхам, на базе некалькіх калгасаў ці саўгасаў. Праз шэсць гадоў вынікі здзівілі нават самога вынаходніка. У саўгасе «Кублічы» Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ўраджайнасць ячменю на полі, дзе прымяняліся ПВК (поліметалічныя водныя канцэнтраты) павялічылася на 3,2 цэнтнера, бульбы — на 15, а цукровых буракоў на 180 цэнтнераў з гектара. «Жывая» вада апраўдала сябе на палетках калгаса «Ленінскія дні» Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці (тут эканамічны эфект ад выкарыстання ПВК на 1 га ячменнага поля склаў 42 рублі, а на ўчастку такой жа плошчы, дзе вырошчвалі караняплоды,— 357 руб. 60 кап.). Не падвяла яна і земляробаў калгаса імя Энгельса Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці, і працаўнікоў калгасаў Ельскага і Калінкавіцкага раёнаў Гомельскай вобласці. У сярэднім, калі браць паказчыкі ўсіх эксперыментуемых гаспадарак, прымяненне ПВК дазваляе павысіць ураджайнасць збожжавых на 10 працэнтаў, караняплодаў — на 25, а шматгадовых траў — на 30—50 працэнтаў. Больш таго, расліны, апрацаваныя ПВК, вельмі ўстойлівыя да хвароб. Напрыклад, ступень захворвання злакавых знікае з пяці да аднаго.

Акрамя біястымулюючай ролі, «жывая» вада можа служыць і дыфулянтам. Варта толькі павялічыць яе канцэнтрацыю і яна здольна, спаліўшы лісце, паскорыць выспяванне семя вікі, лубіну, канюшыны. Такім жа чынам ачышчае ПВК палі ад пустазелля. Без ніякай шкоды для здароўя чалавека. Наадварот, «жывая» вада дазволіць рэзка зменшыць выкарыстанне гербіцыдаў і пестыцыдаў, якія, дарэчы, мы вымушаны купляць за валюту.

У дадатак да гэтага, ПВК дае «чыстую» прадукцыю. Утрыманне нітратаў у раслінах, якія падвяргаліся ўздзеянню поліметалічных водных канцэнтратаў, у два разы меншае, чым у спажываемых намі прадуктах. Поўнай нечаканасцю было для Леаніда Аляксандравіча заключэнне старшага навуковага супрацоўніка Цэнтральнага НДІ курорталогіі і фізіятэрапіі Міністэрства аховы здароўя СССР Уладзіміра Іванавіча Кісялёва, які пацвердзіў не толькі бясшкоднасць ПВК для чалавечага арганізму, але і прапанаваў выкарыстоўваць іх для лячэння артрыту і полеартрыту.

— Магчыма, хутка з'явіцца на прылаўках магазінаў наша «жывая» вада,— заўважыў Леанід Аляксандравіч.

— А на калгасных палетках?—міжволі вырвалася ў мяне пытанне.

— На жаль, не хутка. Хоць выпрабоўваем ПВК ужо чатыры гады, але выйсці за рамкі эксперыменту так і не можам. Усё той жа Інстытут глебазнаўства ўпарта не прызнае эфектыўнасці прымянення «жывой» вады. Нават на калегіі Дзяржагрtoпрома БССР я ставіў пытанне аб шырокім укараненні ПВК у земляробстве. Вынік?

— Здаецца, абнадзейваючы. І рашэнне прынялі аптымістычнае. Аднак настолькі неканкрэтнае і недакладнае, што наўрад ці ажыццявімае ў бліжэйшы час. Тым больш, што старшыня сельгасхіміі В. В. Шувалаў згадзіўся пусціць ПВК у серыйную вытворчасць толькі пасля ўласнаручнага доследнага аналізу,— заключыў Л. А. Дземідовіч.

Што ж, добра, калі кіраўнік такога маштабу, як таварыш Шувалаў, не толькі даверае, але і правярае ўсе прапануемыя вынаходніцтвы. Аднак чаго варты тады чатырохгадовы эксперымент, шматлікія заключэнні розных камісій?

Справа тут не ў асабістых амбіцыях даследчыка. Затрымка ўкаранення ПВК у сельскай гаспадарцы нясе агромністыя матэрыяльныя затраты. Штогод для інструктацыі насення ячменю ў сельскай гаспадарцы рэспублікі перарасходуецца 31 млн. 861 тыс. рублёў, для цукровых буракоў гэты паказчык складае 49 млн. 925 тыс. рублёў. Вось чаму неабходна як мага хутчэй наладзіць серыйную вытворчасць і паўсюднае выкарыстанне «жывой» вады. Зрабіць гэта не так цяжка. Высокамінералізаваная вада сустракаецца на шляху геолагаў, якія вядуць разведку нафты. Як правіла, 80 працэнтаў свідравін не маюць нафты, затое багатыя «жывой» вадой, якую пакуль лічаць непатрэбнай.

Свідравіна ж каштуе ад 500 тысяч да аднаго мільёна рублёў. Кожны год геолагі-разведчыкі свідруюць каля 50 шчылін. Сорак з іх маглі б даваць ПВК. Сабекошт адной тоны цудадзейнай вады пры наладжанай вытворчасці складзе ўсяго 57 капеек, а аддача ў тысячу разоў большая. Нездарма адкрыццём Л. А. Дземідовіча зацікавілася фірма «Інтэртэхніка» пры Дзяржснабе БССР.

З-за мяжы ўжо даўно сыплюцца прапановы на супрацоўніцтва, там згодныя да любых умоў. Толькі для нас (дакладней, для нашых чыноўнікаў з Інстытута глебазнаўства і з Дзяржагрaпрома) гэта адкрыццё здаецца нікчэмным.

— Як гэта ні парадаксальна,— гаворыць Леанід Аляксандравіч,— але некаторых кіраўнікоў з ведамстваў Дзяржагрaпрома і Інстытута глебазнаўства нават здзівіла, калі я звярнуўся да іх з просьбай дапамагчы з памяшканнем для лабараторыі. Бо нам даводзіцца туліцца ў невялікім пакойчыку, выдзеленым універсітэтам, для якога праблема недахопу вучэбных плошчаў — сапраўдная бяда. А было б памяшканне, размясцілі б новае абсталяванне, укамплектавалі б лабараторыю. Гэта ж наколькі хутчэй, эфектыўней было б працаваць! Дапамогу нам прапанавала «Беларусьгеалогія». Гэта арганізацыя зацікаўлена ў выкарыстанні ПВК, тады можна было б атрымаць аддачу ад безнафтавых свідравін. Аднак ісцінай у апошняй інстанцыі ўсё роўна з'яўляюцца Дзяржагрaпром, Інстытут глебазнаўства і сельгасхімія, без іх удзелу «жывая» вада так і застанецца мёртвай.

***Захварэла душа. Страшэнны спусташальны мор зрабіў яе абыякавай да болю і крыўды, да лёсу роднай зямлі. Вылечыць людскія сэрцы ад чэрствасці мог толькі цуд. І з'явіўся чалавек, які не страціў веру ў цудадзейную сілу. Чалавек шукаў «жывую» ваду. І знайшоў. Але... не можа данесці яе да людзей.***

**М. ДЗЯБЁЛА,**
**наш кар.**

# Вас вітае фестываль!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.).

На драўлянай сцэне дзяўчына спявала лірычную песню пра залікоўку і выкладчыцкі састаў. З правага боку ад дзяўчыны гандлявалі «пепсі-колай» і булачкамі, значкамі, казыркамі і майкамі з надпісам «Беларускі дзяржаўны універсітэт». З левага — стаялі аўтобусы і салдацкія палаткі. Свяціла сонца.

— Хто выступае? — спытаў я.

— Філфак,— адказалі мне.

Кожны факультэт імкнуўся ўразіць гледача.

***ЗАЎВАГА З НАТОЎПУ:*** *Разумееш, наша студэнцтва засумавала па студэнцтву.*

*Гады залатыя, дзе яны? Павінны быць вось тут. Таму фестывалі патрэбны. Зразумела.*

А калі перабралі ўсе візітныя карткі, высокі хлопец у шортах грохнуў малатком па медзяной талерцы і заявіў: «Зараз будзе аўкцыён».

І ён не памыліўся. З малатка былі пушчаны: папка рэктара, ручка кандыдата ў дэпутаты, школьны набор замежнай валюты, мноства даведак аб вызваленні «ад чаго толькі не...» «Цяжкавата пайшоў лазневы набор з дэфіцытным мылам і пральным парашком. Падумаць толькі, які легкадумны і бесклапотны народ, гэтыя студэнты!

Ранішнюю праграму заканчвала выступленне каманды КВЗ Белдзяржуніверсітэта. Усе заўсміхаліся, таму што вельмі хутка стала зразумела: «...а мы таксама таго... не горш за ўсялякіх. І наогул...» І ўсе голасна засмяяліся.

***ДУМКА ЧЛЕНА КАМАНДЫ КВЗ:*** *Як мне фестываль? Складанае пытанне. Народу мала. Фестываль — гэта нешта грандыёзнае, а атрымліваецца: ён тут, а універсітэт там. Што гэта такое? Спадзяюся, на наступным фестывалі людзей пабольшае і тады пытанне «Як вам свята?» будзе крыху не да месца.*

«На палянцы даюць грэчку»,— сказаў нехта ў мікрафон. Ранішні канцэрт закончаны, можна ісці абедаць, бо праз некалькі хвілін пачнуцца матчы па міні-футболу, а жыццё стане яшчэ больш цудоўным.

Нейкая кампанія з баянам бударажыць грамадства сваёй весялосцю. Ціха, без лішняга шуму праходзяць спаборніцтвы па турызму.

***ГОЛАС З НАТОЎПУ:*** *Вунь магнітафон ляжыць на лаўцы і ніхто яго не чапае. А сметніцы не паставілі — шкада. Калі б у мяне быў фотаапарат, я б сфатаграфаваў гэтыя лаўкі з папяровымі стаканчыкамі.*

Цяжкія гадзіны незаўважна кончыліся. На сцэне

па чарзе ігралі мускуламі ўдзельнікі спаборніцтваў па гіравому спорту. Даўжэй за ўсіх не пакідаў юны юрыст Валодзя Ціунчык. Сорак пяць разоў падымаў і апускаў ён свае гіры. Пасля гэтага засталося толькі раздаць прызы спартсменам і актывістам фестывальнага руху. Па выніках фестывалю самымі лепшымі і актыўнымі аказаліся будучыя юрысты. І атрымалі за гэта ВІДЭАМАГНІТАФОН.

Першым нумарам канцэртнай праграмы аказаўся фальклорны ансамбль «Неруш». «Брава! Біс!» — час ад часу чулася з лавак, дзе сядзелі студэнты.

Заглушаючы ўсё на свеце, хадзіла па паляне вясёлая кампанія з баянам. Але радасць іх была нядоўгай. На сцэне з'явіліся вядомыя ўсяму універсітэту рок-брыгады, і гледачы, тыя, хто больш прадбачлівы, перасялі на заднія рады.

Сумбурна неяк у мяне атрымалася. Але, напэўна, інакш і быць не павінна, таму што фестываль быў першым і да таго ж студэнцкім. А вам удалося б напісаць хранікальную справаздачу пра сустрэчу світанку? Я думаю: не. Гэта на дзіва неўдзячлівы занятак — пісаць рэпартажы са студэнцкіх фестываляў. Таму што лепш за ўсё самому там пабываць. Я ж толькі паспрабаваў перадаць вам, які быў настрой у мяне, таго, хто бачыў усё сваімі вачыма. Так што, прабачце за сумбур. Спецыяльна для педантаў я запісаў словы Сяргея БАЛАШЭНКІ, намесніка сакратара камітэта камсамола, аднаго з арганізатараў фестывалю:

**— Кожны год універсітэт арганізоўваў турыстычны злёт. Турысты збіраліся недзе за 150 кіламетраў ад Мінска. Вогнішчы, песні — усё гэта цудоўна. Але там збіралася ўсяго каля двухсот чалавек. І мы ў камітэце камсамола, падумаўшы, вырашылі арганізаваць такі фестываль, куды б мог трапіць увесь універсітэт. Былі спрэчкі: дзе праводзіць фестываль: у парку імя М. Горкага ці ў Вязынцы? Вязынка — гэта ж цудоўныя мясціны, тут усе будуць усміхацца толькі таму, што прырода не дазволіць сумаваць. Грошы, якія пайшлі на фестываль,— гэта фонды, членскія ўзносы. Дапамог таксама рэктарат. Закупілі 40 кг мяса, 30 кг цукру, крупы і хлеба — ужо не памятаю колькі і ўручылі ўсё гэта салдатам, каб тыя накармілі нас. Праўда, пагода падвяла. Многіх яна напалохала. А, магчыма, проста першы раз гэты фестываль?**

**Я лічу, што папрацавалі мы нядрэнна, і за арганізацыю мне не сорамна. З ног збіўся, але, здаецца, не дарма.**

**А. ҚІШКІН,**
**студэнт факультэта журналістыкі.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
18 мая
Зак. 1623.
Т. 2000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.